# Камэнтар Крыстафа Бэртрама да З.Бжазіньскага

**Крыстаф Бэртрам** — рэдактар амэрыканскага часопісу *Foreign Policy* і дырэктар *Stiftung für Wissenschaft und Politik,* досьледнага цэнтру міжнароднай палітыкі, аднаго з дарадчых органаў нямецкага ўраду і нямецкага парлямэнту.

Нягледзячы на многія слушныя заўвагі, прадказаньне Бжазіньскага што да стасункаў ЗША і Эўропы ў будучыні мае ўрэшце служыць супакаеньню яго самога, а таму яно перакручанае. Мы можам абагульніць яго адным сказам: Эўропа, страшэнна далёкая ад таго, каб зрабіцца супернікам Злучаных Штатаў, застанецца залежнай пераменнай, карыснай прыладай для ажыцьцяўленьня амэрыканскае стратэгіі, накіраванай на пашырэньне прасторы стабільнасьці на як мага большую колькасьць краінаў, за выняткам Расеі, шляхам іх далучэньня да Альянсу; яна будзе задавальняць усе прыхамаці Злучаных Штатаў, але не павінна ўважацца за раўнапраўнага партнэра.

Аднак у адным Бжазіньскі мае рацыю: амэрыканцы не павінны панікаваць, калі ЭЗ спрабуе паскорыць інтэграцыю ў абароннай сфэры. Гнеў, якім час ад часу выбухае Вашынгтон з нагоды плянаў эўрапейцаў нязначна палепшыць здольнасьць сваіх сілаў апэратыўна ўмешвацца ў справы „за межамі рэгіёну", нічым не апраўданы: які б плён гэтыя пляны ні далі, эўрапейскія ўзброеныя фармаваньні вымушаныя будуць карыстацца амэрыканскай вайсковай тэхнікай, а таму ім давядзецца ўзгадняць свае пляны з амэрыканцамі.

Але рабіць з узброеных сілаў лякмусавую паперку эўрапейскай інтэграцыі — значыць, паўтараць памылку Сталіна, які пра Каталіцкую царкву меркаваў паводле колькасьці дывізіяў у яе распараджэньні. Нават Бжазіньскі, найбольш па-эўрапейску настроены чалавек сярод амэрыканскіх прыхільнікаў *Realpolitik*, не разумее, навошта, уласна, узьнікае гэтая новая Эўропа. Яна для яго — *„палітычная супольнасьць, збудаваная на выгадах"*, але ніяк не на *„перакананьні"*, прагматычны вытвар, прызначаны для завядзеньня дабрабыту й стабільнасьці, якімі ўсе будуць дзяліцца. Аднак прагматызм ня ёсьць дастатковым тлумачэньнем таго, чаму дзяржавы, гордыя за сваю гісторыю, ахвяравалі сваёй нацыянальнай аўтаноміяй на карысьць сваёй эўрапейскай узаемазалежнасьці. Тое, што прывяло іх да падпарадкаваньня аўтарытэту супольных законаў і супольнаму найвышэйшаму суду, стварэньня супольнай валюты, аб'яднаньня заходняй часткі кантынэнту, запрашэньня новых дэмакратыяў у астатняй Эўропе ў свой асяродак і цяперашніх спробаў знайсьці сродкі на арганізацыю самастойнай вайсковай дзейнасьці, абсалютна дакладна ніколі не грунтавалася адно на выгадах. У падмурку яго была і ёсьць пэўная ідэя Эўропы, пэўнае ўяўленьне пра яе.

Моцы гэтай ідэі ня варта недаацэньваць. Амэрыканцы ж такую памылку звычайна рабілі, дарма што цярпліва, цягам дзесяцігодзьдзяў халоднай вайны, стымулявалі Эўропу да інтэграцыі. Сёньня, калі іх, магчыма, насьцярожвае нованабытая ўпэўненасьць Эўропы ў сабе (а да гэтай насьцярожанасьці далучаецца, з аднаго боку, вузкалобае захапленьне ўласным вайсковым і тэхналягічным патэнцыялам, а з другога — замарака ад раскошы становішча адзінай і, відаць, апошняй сусьветнай супэрдзяржавы), здаецца, што амэрыканцы страцілі як цярплівасьць, так і зрок. Сумна, што Бжазіньскі яшчэ й прапаноўвае стратэгічнае абгрунтаваньне гэтай страты.

Але гэта недальнабачны падыход, і менавіта з прычынаў, якія аўтар так красамоўна фармулюе ўва ўводзінах да свайго артыкулу: *„Саюз Амэрыкі з Эўропай стварае ў сьвеце вось стабільнасьці"*. У Амэрыкі няма іншага партнэра, які б гэтак клапаціўся пра парадак на міжнароднай арэне, дабрабыт і прагрэс дэмакратыі. Эўропа пры ўсіх яе заганах сёньня значна мацнейшы партнэр, чымся яна была ў часе халоднай вайны. А ў будучыні яна зробіцца яшчэ мацнейшай.

Таму галоўным амэрыканскім інтарэсам сёньня мела б быць закладаньне падмурку партнэрства з заўтрашняй Эўропай. Панаваньне ЗША, магчыма, працягнецца яшчэ гадоў дваццаць-трыццаць, аднак яно ня будзе вечным. Хіба можна знайсьці лепшы ўжытак з гэтае сёньняшняе часовае выгады, чымся як сёньня пачаць утвараць інстытуцыйныя рамкі для партнэрства, дзякуючы якому Эўропа, мацнейшая, чымся цяпер, і Амэрыка, слабейшая за свой цяперашні стан, маглі б разам імкнуцца да ладу, дабрабыту і дэмакратыі ў заўтрашнім сьвеце? Гэта, доктару Бжазінські, *Realpolitik*, якую трэба сабе ўявіць!

## Камэнтар Тыматы Гартана Эша да З.Бжазінскага

**Тыматы Гартан Эш** — аўтар кнігі *History of the Present: Essays, Sketches and Dispatches from Europe in the 1990s* (выдавецтва *Random House*), якая выйшла ў 2000 г. Гэты камэнтар ён напісаў, калі ў якасьці стажора знаходзіўся ў *Hoover Institution* Стэнфардзкага ўнівэрсытэту ў Каліфорніі.

Гэты артыкул Зьбігнева Бжазінскага, як і заўжды, ясны, пранікліві, творчы і надзвычай абсяжны. Мая праблема ў тым, што я згодны як з большынёй высноваў ягонага аналізу, так і з парадамі, якія ён дае палітыкам, асабліва што да пашырэньня NATO і ЭЗ. Тым ня менш, дазвольце мне як эўрапейцу, чалавеку родам з брытанскіх выспаў, спыніцца на пяцёх рэчах, якія, на маю думку, мусова ўдакладніць.

Па-першае, я заўжды быў за тое, каб называць рэчы сваімі імёнамі, нават калі ў палітычным сэнсе гэта нічым ня будзе сябе апраўдваць. Цьверджаньне, што Эўропа ёсьць *„de facto вайсковым пратэктаратам Злучаных Штатаў“*, не падаецца мне цалкам праўдзівым. Калі я скажу, што *„Ксанаду ёсьць францускім пратэктаратам“*, дык на ўзроўні банальнае эрудыцыі пад гэтым разумеецца, што французы ў Ксанаду ўладараць. Аднак амэрыканцы ў Эўропе не ўладараць. І калі гэтыя словы ўзяць у іншым сэнсе, чымся *„быць залежным ад вайсковай абароны“*, дык гэтае цьверджаньне наўрад ці апраўданае, бо, нягледзячы на цяперашні хаос у эўрапейскай абароннай сфэры, на сёньня нашай бясьпецы нічога сур'ёзна не пагражае. Я маю на ўвазе пагрозы такога кшталту, ад якіх галоўныя эўрапейскія дзяржавы ня здолелі б абараніць сябе ці сваіх партнэраў па ЭЗ.

Праўда, па-другое, вядома, што нават наймацнейшыя краіны ЭЗ усё яшчэ мусяць спадзявацца толькі на Злучаныя Штаты пры патрэбе вядзеньня вайсковай апэрацыі за межамі ЭЗ, нават калі гаворка пра такі малы кавалак нашае зямлі, як Косава. Карысна было б шчыра прызнаць, што адной з галоўных прычынаў гэтага стану ёсьць тая акалічнасьць, што лідэры Заходняй Эўропы пры канцы халоднай вайны няправільна вызначылі прыярытэты, аддаўшы перавагу ўвядзеньню супольнай валюты, а не стварэньню супольнага войска. Ініцыятывы апошняга часу, скіраваныя на аптымізацыю замежнай палітыкі і каардынацыю абаронча дзейнасьці — гэта спроба ЭЗ нагнаць у 2000 годзе нераспачатае ў 1990-м. (Гэтае цьверджаньне я падрабязьней разьвіваю ў сваёй новай кнізе *History of the Present / Гісторыя сучаснасьці*.)

Па-трэцяе, Бжазінські абсалютна слушна адзначае безумоўную неабходнасьць такое палітыкі Злучаных Штатаў, пры якой Вашынгтон разглядалі б у якасьці таго, хто гэтыя запозьненыя ініцыятывы, асабліва што датычаць вайсковае сфэры, хутчэй ухваляе, а ня журыцца зь іхнае нагоды. Палітычнае пасланьне новае амэрыканскае адміністрацыі павінна гучаць абсалютна пазытыўна і адназначна: *„Мы хочам, каб Эўропа стварыла мацнейшую абаронную індывідуальнасьць і эфэктыўныя вайсковыя сілы, прызначаныя для хуткага рэага-*